Источник: "Веды" - 2012-12-26

# КАЛЕЙДАСКОП БЕЛАРУСКАЙ НАВУКІ




**На мінулым тыдні падчас імпрэзы ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы НАН Беларусі супрацоўнікі Выдавецкага дома «Беларуская навука» разам з калегамі з Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў (АГНМ) ды іншымі гасцямі падвялі вынікі 2012 года і распавялі пра планы на будучае.**

Мерапрыемства завяршыла шэраг творчых сустрэч, якія садзейнічалі правядзенню ў нашай краіне Года кнігі. Пра большасць з іх мы не раз падрабязна гаварылі на старонках нашага тыднёвіка. Сапраўдны калейдаскоп навінак ад ВД «Беларуская навука» мы прадстаўлялі нашым чытачам у адпаведнай рубрыцы.

Адкрыў імпрэзу акадэмік-сакратар АГНМ Аляксандр Каваленя **(на фота)**. Ён звярнуў асаблівую ўвагу на манаграфію «Полацк», якая ўвасобіла ў сабе калекцыю матэрыялаў пяці пакаленняў навукоўцаў. Кніга стала вельмі папулярнай – зараз у продажы яе не знайсці.

Сярод удзельнікаў мерапрыемства быў і А.Стэцкевіч-Чэбаганаў, вядомы аўтар-даследчык старажытных родаў Беларусі. Каля 100 навуковых тамоў ён перадаў у дар ЦНБ НАН Беларусі. Падчас імпрэзы А.Каваленя ад імя Прэзідыума НАН Беларусі ўручыў А.Стэцкевічу-Чэбаганаву Ганаровую грамату.

Дарэчы, як адзначыў галоўны рэдактар галоўнай рэдакцыі кніжных выданняў і навуковых часопісаў НАН Беларусі ВД «Беларуская навука» Георгій Кісялёў, па колькасці назваў сёлета традыцыйна лідыруюць якраз гуманітарыі. У наступным годзе плануецца пашырыць калейдаскоп выданняў да 132 найменняў, 125 з якіх – кнігі акадэмічных аўтараў.

Таксама ўвазе гасцей імпрэзы быў прапанаваны відэафільм, які распавядаў пра супрацоўніцтва акадэмічных бібліятэкараў і выдаўцоў у справе папулярызацыі навуковай літаратуры. Дарэчы, на сайце бібліятэкі можна пазнаёміцца з віртуальнай выставай кніг ад ВД «Беларуская навука», якія сёлета пабачылі свет.

**Сяргей ДУБОВІК**
**Фота аўтара, «Веды»**